# ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ Ў ЗАХОДНІХ АБЛАСЦЯХ

**(Гутарка з старшынёй Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР тав. Наталевічам)**

15 кастрычніка пачынаецца выбарчая кампанія па выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных заходніх абласцей БССР.

Да гэтай велізарнай важнасці палітычнай кампаніі працоўныя заходніх абласцей прыходзяць узбагачаныя вопытам сацыялістычнага будаўніцтва, вопытам барацьбы за вялікую справу партыі Леніна — Сталіна. Першы год жыцця пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі прынёс свае выдатныя плады. Працоўныя на справе пераканаліся, што значыць жыць і працаваць на сябе, на карысць сваёй сацыялістычнай радзімы. На клопаты партыі і ўрада яны адказваюць стаханаўскай работай на прадпрыемствах, на калгасных палях, быстра падымаюць гаспадарку і культуру прыгнечанага ў мінулым края.

Пасля выбараў у Вярхоўны Совет БССР выбары ў мясцовыя Советы па сутнасці завяршаюць перабудову дзяржаўных органаў у заходніх абласцях Беларусі ў адпаведнасці з патрабаваннямі і нормамі Сталінскай Канстытуцыі. Размах прадстаячай выбарчай кампаніі патрабуе ад усіх партыйных, совецкіх, камсамольскіх і прафсаюзных арганізацый вялікай работы. Калі ў Вярхоўны Совет БССР ад заходніх абласцей было выбрана 202 дэпутаты, то ў мясцовыя Советы трэба будзе выбраць каля 42.000 дэпутатаў. Адных толькі членаў акруговых і ўчастковых выбарчых камісій неабходна больш 185 тысяч чалавек. Гэтыя лічбы гавораць самі за сябе.

Выбары ў абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных адрозніваюцца ад выбараў у Вярхоўны Совет БССР тым, што яны будуць на многа больш складанымі з пункту гледжання арганізацыйнага і тэхнічнага. Гэтыя выбары будуць праводзіцца адразу адным турам ва ўсе звенні мясцовых Советаў. У сувязі з гэтым патрабуецца вялікая колькасць людзей для работы ў якасці прапагандыстаў і агітатараў на выбарчых участках, а таксама для работы ў акруговых і ўчастковых выбарчых камісіях.

З боку партыйных, совецкіх і грамадскіх арганізацый патрабуецца куды больш напружаная работа. Неабходна будзе скарыстаць багацейшы вопыт, накоплены ў часе выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР. Трэба поўнасцю скарыстаць велізарны актыў, які апраўдаў сябе ў часе мінулых выбараў, падрыхтаваць і вылучыць новую армію актывістаў для гэтай вялікай дзяржаўнай работы.

Працоўныя заходніх абласцей БССР вылучылі лепшых людзей у Вярхоўны Совет СССР і Вярхоўны Совет БССР. І зараз, на аснове непераможнага сталінскага блока комуністаў і беспартыйных, народ вылучыць сваіх лепшых сыноў і дачок, чым яшчэ раз дакажа сваю адданасць сацыялістычнай радзіме. Аб гэтым сведчыць тое натхненне, з якім рабочыя, калгаснікі, інтэлігенцыя заходніх абласцей рэспублікі сустрэлі Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР аб выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.